— Анатолий Игнатьевич, Вы хорошо знаете, как готовились, защищались и утверждались диссертации в советские времена. Знаете, как это делается и теперь, когда вся эта кухня варится ВАКом Беларуси. Есть что-нибудь общее между прошлой и нынешней ситуацией, когда, скажем, диссертация того же Тарасова была, грубо говоря, зарезана?

— Я не сомневаюсь: проблема, с которой столкнулся В.Тарасов, носит общественный, а не частный характер, ибо речь идет о подмене науки заангажированностью, политическими пристрастиями высших чиновников, их стремлением в угоду власти блюсти чистоту государственной идеологии. В нынешних условиях защита диссертаций с критикой государственного устройства и системы экономики Беларуси невозможна. ВАК Беларуси, по существу, превратился в инструмент политической цензуры и проводит своеобразную селекцию научных работ через призму определенных политических и идеологических критериев. Тем самым определяются "свои" и "чужие". "Свои" утверждаются, а "чужие" отбрасываются как "научно несостоятельные".

— Вправе ли ВАК Беларуси оценивать научные работы по идеологическим и политическим критериям?

— В советские времена, когда общественные науки были партийными, подобные действия ВАК СССР еще можно было както объяснить и понять. В последние годы мы являемся свидетелями возвращения идеологической цензуры, превращения ее в инструмент общественного воздействия на массовое сознание. Сегодня, как никогда раньше, в Республике Беларусь обострилась борьба между представителями различных политических ориентаций и особенно между ретроградами и либералами. В этой борьбе определяется выбор стратегии дальнейшего развития страны.

Возврат к политической цензуре с позиции большевистской идеологии начался, на мой взгляд, год назад, когда главным идеологом страны стал В.П.Заметалин. Многое станет понятным, если внимательно вчитаться в интервью под названием "Правды жаждущий И. Пашкевич", опубликованное в газете "Свободные новости" от 15 июня 2001 года. Противостояние идей на вершине президентской власти с этого времени закончилось, и началась откровенная идеологизация белорусского общества через реанимацию коммунистической идеологии. Многие государства отказались от самого понятия "идеология", сосредоточив основное внимание на ценностях, которые могут консолидировать нацию. У нас же, как в приснопамятные советские времена, начался новый идеологический ренессанс. О его недопустимости и неправомерности я достаточно аргументированно высказался в статье "Общественно-политическая ситуация в Беларуси как выражение взаимообусловленности гражданского общества и государства", которая была опубликована в сборнике научных трудов. Мое видение проблемы неожиданно совпало с мнением И.И.Пашкевича, с которым я никогда не был знаком лично. К сожалению, это мнение сегодня не разделяют официальные власти.

Ко двору пришлись политически ангажированные и преданные душой и телом нынешнему режиму "ученые", многие из которых упоминались в статье В. Тарасова. Вовсе неслучайно, что некоторые из моих бывших коллег из Института социально-политических исследований при Администрации президента (Л.Е. Криштапович, И.В. Котляров) вошли в состав нового экспертного совета ВАК Беларуси по социологическим и политическим наукам, который и принял соответствующее решение по диссертации В. Тарасова. Зная их идеологические убеждения, можно утверждать, что в ВАКе Беларуси введена жесткая политическая цензура со стороны сторонников коммунистической идеологии. В диссертации же В.Тарасова исповедуется либерализм, который на дух не переносят идеологи-ретрограды. Думаю, этим объясняется решение ВАК Беларуси не утвердить докторскую диссертацию В. Тарасова. Скажите, о какой свободе мнений можно говорить при насаждении тотальной государственной идеологии? Мне кажется, что проблемы, затронутые в статье В. Тарасова, являются лишь прелюдией к более серьезным проблемам, с которыми в ближайшее время может столкнуться не только социологическая, но и общественная наука Беларуси в целом.

Работа В. Тарасова дискуссионна, так и должно быть в науке. Однако я категорически против оценки научных работ с позиции любой идеологии. В моноидеологии я вижу причину многих бед нашего общества, таких, как насилие государства над личностью, отсутствие возможностей защитить свои права. И неважно, является ли носителем этой идеологии государство, партия или отдельная личность. Первые революции и первая пролитая кровь стали возможными лишь тогда, когда появились политические авантюристы, заявившие, что они обладают истинно научной идеологией, с позиции которой можно перестраивать общество. Особенно опасно, когда эти авантюристы являются ко всему еще амбициозными, беспринципными и фанатично верят в мессианскую идею. Еще К. Маркс отмечал, что "любая идея неизменно посрамляла себя, как только вступала в противоречие с практикой". Я считаю, что начинать надо с анализа существующей социокультурной практики, основ гражданского общества, а не с поиска национальной или какой-нибудь другой идеи.

— Анатолий Игнатьевич, действительно ли в ВАК Беларуси наукой сегодня правит политическая охранка?

— Отчасти да. В своей практике я неоднократно сталкивался с вопиющими фактами, которые позволяют думать именно так. Когда я работал в Институте социально-политических исследований при Администрации президента Республики Беларусь, мне принесли диссертацию сотрудника КГБ А. Тиханского, на которую я должен был написать проект отзыва ведущей организации. Она оказалась достаточно слабой и фактически не содержала социологического анализа. Моя взвешенная критика вызвала явное недовольство у соискателя, который пожаловался на меня руководству института. Отзыв был переделан в "нужном духе" ученым секретарем института небезызвестным Л.Е.Криштаповичем и без обсуждения на заседаниях отдела и на ученом совете института подписан заместителем директора института М.И. Хурсом.

Но беспредел на этом не закончился. Диссертация была засекречена, хотя никаких сведений, имеющих отношение к государственной безопасности, в ней не было. Затем руководство ВАК Беларуси из 17 членов специализированного совета по защите докторских диссертаций отобрало 9 наиболее покладистых. Как и следовало ожидать, я в их число не вошел, хотя диссертация соответствовала моей специальности, из членов специализированного совета у меня одного был доступ КГБ к работе с особо секретной информацией. Это давало мне право присутствовать на защите и даже задавать соискателю нежелательные для него вопросы. Таким образом, я был зрителем этого одиозного спектакля. Соискатель не смог ответить ни на один мой вопрос. Ему на помощь пришел генерал КГБ С.Н. Князев из Института национальной безопасности. После его выступления совет проголосовал почти единогласно "За". Прохождение диссертации А. Тиханского в ВАК Беларуси прошло как по маслу. Такова научная принципиальность ВАК Беларуси. И подобные примеры вовсе не единичны.

— В научных кругах бытует мнение, что особыми привилегиями у ВАК Беларуси пользуются работы лиц, приближенных к власти?

— С советских времен в общественную науку хлынула волна партийных функционеров из аппарата государственного и хозяйственного управления. Тут я полностью солидарен с В. Тарасовым, что ВАК Беларуси дал "зеленый свет" псевдоученым, которые имеют хоть какое-то отношение к государственной власти. Эти менеджеры от науки пользуются особым приоритетом у ВАК Беларуси при присуждении ученых степеней и званий. Сегодня наша наука буквально наводнена учеными, которые не имеют к ней никакого отношения: бывшими заместителями министров, партийными, комсомольскими работниками, крупными и мелкими чиновниками. Некоторые из них стали академиками, членами-корреспондентами и заняли ключевые посты в системе образования и управления наукой. И это при том, что в свое время эту тенденцию пытался сдержать П.М. Машеров, который весьма критически относился к чиновникам, желавшим получить ученую степень.

ВАК Беларуси со времен своего образования превратился в кузницу научных кадров кандидатов наук и докторов из номенклатуры: государственных чиновников, высокопоставленных военных и офицеров КГБ. Тем более что ученая степень сегодня является своеобразной визитной карточкой для дальнейшей карьеры. Особенно много таких карьеристов, как мне известно, среди докторов педагогических наук. Раньше ведь партийный стаж засчитывался как педагогический. Эти ученые-менеджеры, возомнившие себя корифеями в науке, есть и среди нынешнего руководства ВАК Беларуси. Понятно, что им хорошо знакома задача идеологизации науки, и они, сломя голову, бросились реализовывать руководящую установку сверху. К великому сожалению, наиболее авторитетным "научным" органом для ВАК Беларуси является Институт социально-политических исследований при Администрации президента Республики Беларусь. На это квазинаучное учреждение возложены функции координации социологических исследований в Республике Беларусь. Однако кроме идеологической ангажированности там не было и нет никакой науки. Обращаться сюда за научной экспертизой — значит совершать открытое преступление не только перед наукой, но и перед своим народом.

— Судя по Вашей оценке деятельности Института социально-политических исследований при Администрации президента, у Вас есть все основания не доверять экспертизам его сотрудников?

— Могу с полной уверенностью заявить, что Институт социально-политических исследований при Администрации президента Республики Беларусь не в состоянии дать квалифицированное научное заключение о работах. Экспертом по научным работам в подавляющем большинстве случаев является ученый секретарь института Лев Криштапович, который получил ученую степень доктора философских наук за обоснование вечности и неизменности коммунистической идеологии. В Институте фактически нет никакой теоретической базы. Все держится на голом эмпирическом анализе и идеологической оценке фактов. Это хорошо видно по ежегодно издаваемым сборникам работ по результатам социологического мониторинга под общей редакцией "выдающегося" специалиста по всем областям наук М.И. Хурса. Такая наука в стенах Института получила название "охурсированной" или "тутэйшай навукі дзеда Талаша".

Похоже, история повторяется. Когда-то в СССР "опричники от науки" также опирались на соответствующие идеологические структуры типа нынешнего Института социально-политических исследований при Администрации президента, которые всегда готовы были выполнить любой идеологический заказ. Я думаю, что если бы В. Тарасов написал свою диссертацию в русле идеологических изысканий ИСПИ при Администрации президента, у него бы не возникло никаких проблем. Отвечать же за научную недобросовестность и нечистоплотность, похоже, никто — ни в ВАК Беларуси, ни в ИСПИ — не собирается. Найдутся люди, готовые угодить власть имущим и проинтерпретировать любые факты в их пользу.

— Спасибо Вам за столь обстоятельное интервью, Анатолий Игнатьевич.

Антон КОРЗУН.

-Я БУДУ ОТКРОВЕНЕН И КРАТОК...

Художник Владимир ЧУГЛАЗОВ, г. Брест.

Прыслугачы пустазвону

Не так даўно газета змясціла цікавы артыкул вучонага Уладзіміра Тарасава "Опричники от науки". Але сенсацыйныя сакрэтныя матэрыялы, звязаныя са зніккненнем у краіне вядомых людзей, ды прэзідэнцкая свістапляска вакол выбараў неўпрыкмет адціснулі яго на другі план.

Асабіста для мяне гэта былі разважанні мужнага чалавека і прынцыповага вучонага, які не пабаяўся адкрытых ганенняў і расказаў нам пра тое, чым жыве сёння навука і як нізка яна апусцілася. З'ехала ў тую брыдотную яму, дзе даводзіцца займацца абслугоўваннем "вярхоў" і весці ўсе распрацоўкі, зазіраючы ў рот кіроўцам.

Таму і прыходзіцца цяперашнім "прыслугачам ад навукі" сачыць за дзяржаўнымі прамоўцамі, што часта займаюцца апантаным пустазвонствам. Ды пад нейкую ахінею, якую тыя нясуць з трыбуны, тэрмінова бу- [illegible]

[illegible] Але ж, зразумела, Прэзідыум [illegible]

ВАК разам з А.Дастанкам салідная праца Тарасава стала косткай у горле. Прычына тут адна: аб'ектыўныя погляды чалавека на карысць рыначнай мадэлі гаспадарання, крытыка аўтарытарных падыходаў дзяржавы да арганізацыі эканамічнага жыцця.

Вельмі шкада сапраўды сумленных людзей, што яшчэ засталіся ў нашай навуцы. Бо яе наваднілі "заказныя спецыялісты" ад улад. Аўтар артыкула шмат месца ўдзяляе доктару філасофскіх навук Л.Е.Крыштаповічу. Той выбіўся ў "вярхі" акадэмічнай навукі і пачынае граміць тых, [illegible] — у "Народнай газеце". Менавіта яна шмат месца ўдзяліла яму ў артыкуле "Кандыдат ліповых навук" (12—14 ліпеня 1994 г.). [illegible]

"Особо следует сказать о напряженном научном творчестве Института философии и права Академии наук. [illegible] Р.Блихарда "Возрастание руководящей роли рабочего класса в период коммунистического строительства" (на материалах БССР), М.Бородича "Коммунистическая убежденность как важный фактор творческой активности трудящихся". *Л.Криштаповича "Коммунистический идеал и социальная действительность"* (Выдзелена мною. — **П.С.**).

О последнем заметно прогрессирующем (судя по публикациям в газете "Мы и время") ученом следует рассказать более подробно, поскольку он и сейчас, если верить бумажкам, плодотворно работает в означенном институте над темой "Историческая правда социализма и философская истина человечества". Вероятно, лучшего вложения средств в науку на данном этапе нельзя придумать.

Достаточно привести лишь одну выдержку из автореферата этого ученого, чтобы представить [illegible]

"...Реальный социализм и коммунистический идеал отличаются друг от друга, но это их различие ничего общего не имеет с абстрактным противопоставлением их друг другу в качестве самостоятельных существований, [illegible] друг в друге, и истиной которых является их отношение друг к другу".

С умным видом слушали все это члены специализированного совета и задавали столь же умные вопросы.

Доктор философских наук А.Головнев:

— В автореферате на стр.7 говорится о том, что утопический идеал не отрывался от действительности, а на стр.9 высказана мысль, что существенным признаком утопии является отрыв от реальной действительности. Нет ли здесь противоречия?

Ответ:

— Когда речь идет об отрыве утопического идеала от действительности, то это значит, что утопический идеал не имеет связи с материальной действительностью, а не с действительностью вообще. В то же время, когда проводится мысль о связи утопического идеала с действительностью, о заземлении первого в последней, то этим мы подчеркиваем связь утопического идеала только с идеальной сферой человеческой деятельности...

Эту обширную цитату я позволил лишь для того, чтобы вы представили себе, что выдавали за истинную науку ученые мужи, [illegible]

Вы зразумелі, якія дзелавыя сёння крэўнікі вучонымі? [illegible] "Найбольш трагічныя перыяды вынік масавага вынішчэння беларускага народа ў XV—XX стагоддзях". Гэтыя тэмы ўмоўныя, але надта надзённыя, таму просяць сваіх навуковых распрацовак.

А што ў навуцы звязана з роллю кампартыі ці камсамола?.. Мутарна становіцца ад гэтых "аб'ектыўных" распрацовак, ад тых рабалепскіх пісанняў, за што раней адразу прысвойвалі званне. Калі ў назве кандыдацкай або доктарскай працы сустракаю словы "Роля кампартыі..." ці "Роля камсамола...", то ведаю, што далей з "працай" можна не знаёміцца. Бо роля гэта "вялізная", "непераўзыдзеная", "незамянімая". Ці ў павышэнні ўраджайнасці збожжавых альбо росце працягласці жыцця савецкага чалавека, вынішчэнні грызуноў на складах спецмагазінаў ці пабудове новых туалетаў ва ўсходніх [illegible] генный спадчыне беларускай —

Пятро СМАЛЯНКА.

АМЕРИКАНСКАЯ ТРАГЕДИЯ

Джордж БУШ:

“Я прыцягну ўсе рэсурсы, каб знайсці і пакараць вінаватых”

Прэзідэнт ЗША Джордж Буш выступіў з прамовай да амерыканскага народа. Яго выступленне па нацыянальным тэлебачанні было выразна эмацыянальнае, але адначасова поўнае рашучасці. У гэты момант прэзідэнт ЗША, відавочна, гаварыў і адчуваў тое, што адчувалі мільёны амерыканцаў.

Джордж Буш: *“Тысячы людзей загінулі ў выніку неспадзяваных, злачынных і ганебных актаў тэрору. Карціны самалётаў, якія ўрэзваюцца ў будынкі, пажары, абвал вялізных пабудоў спарадзілі сярод нас недаўменне, страшэнны жаль і абурэнне, якое немагчыма стрымаць”. “Гэтыя акты масавага забойства былі накіраваны на тое, каб запалохаць наш народ, каб выклікаць хаос і прымусіць нас адступіць. Але тэрарысты памыліліся. Наша краіна моцная. Вялікі народ паўстаў на абарону вялікай краіны. Тэракты могуць ускалыхнуць падмуркі нашых самых высокіх будынкаў, але яны не ў стане падарваць асновы амерыканскага грамадства. Яны могуць пашкодзіць сталь, але яны не ў стане пахіснуць стальную рашучасць амерыканцаў”.*

Джордж Буш паведаміў, што ўсе ўстановы федэральнага ўрада цалкам адноўяць сваю працу. Ён таксама запэўніў, што Злучаныя Штаты зробяць усё магчымае, каб знайсці і пакараць адказных за гэтыя тэракты: *“Працягваецца пошук тых, хто стаіць за гэтымі злачыннымі актамі. Я накіраваў усе разведвальныя і праваахоўныя рэсурсы, каб знайсці вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасці. Мы не будзем рабіць розніцы паміж тэрарыстамі, якія ўчынілі гэтыя злачынствы, і тымі, хто дае ім прытулак”.*

Дарэчы, дагэтуль ніхто не ўзяў на сябе адказнасць за тэракты. Таксама Злучаныя Штаты публічна не назвалі нікога, каго б яны падазравалі ў замахах. Амерыканскія Узброеныя сілы прыведзены ў стан павышанай боегатоўнасці. Узмоцнены таксама сродкі бяспекі вакол усіх амерыканскіх пасольстваў і прадстаўніцтваў ЗША па ўсім свеце.

Радыё “СВАБОДА”.

Як змяніцца міжнародная палітыка пасля 11 верасня

Некалькі відавочных высноваў пасля тэрактаў у ЗША

11 верасня 2001 года тэрарыстамі была пастаўлена апошняя кропка ў колішнім процістаянні паміж Захадам і Усходам. “Процістаянні”, што апошнія гады было нейкім надуманым, “кніжным” — для патурання ідэалагічных патрэб і комплексаў уласнага электарату — што ў Расіі, што ў ЗША. Выбухі ў ЗША з усёй выразнасцю паказалі адзіна магчымы палітычны [illegible] што Поўначы (Паўночнай Амерыцы, Еўропе, Расіі і Японіі) няма чаго дзяліць паміж сабой. Яны стаяць на адным баку барыкады. Праблемы апошніх гадоў у адносінах паміж Захадам і Расіяй (пашырэнне НАТО, [illegible]) на фоне 11 верасня выглядаюць нязначнымі. Зараз намячаецца процістаянне паміж Поўначчу і Поўднем, паміж цывілізаваным светам і сіламі бязлітаснай і бессэнсоўнай помсты.

Выбухі ў Амерыцы выклічуць (і ўжо выклікаюць) зразумелае пачуццё салідарнасці з ЗША ў еўрапейцаў і цывілізаваных людзей ва ўсім свеце. Часова адыдуць у бок праявы вульгарнага і часам карыкатурнага антыамерыканізму, калі еўрапейскія інтэлектуалы пагардліва бэсцяць амерыканскія фільмы і гамбургеры. Гэты “кухонна-кіношны антыамерыканізм”, урэшце, нікому не замінае ў тым выпадку, калі еўрапейцы стратэгічна разумеюць, наколькі яны малаабаронены перад наступам сіл зла і анархіі. Наколькі зараз неабходна агульная еўраатлантычная еднасць, еднасць, урэшце, усёй хрысціянскай цывілізацыі.

У вежах-блізнятах, відавочна, загінулі не толькі амерыканскія грамадзяне, там знаходзіліся офісы многіх еўрапейскіх і японскіх кампаній. Такім чынам, тэракты ў Амерыцы — гэта вайна супраць усяго цывілізаванага свету. Вайна без аб’яўлення мэтаў і ўмоваў. Тэрарысты, заўважым, не вылучалі аніякіх патрабаванняў. Іхні акт — гэта своеасаблівая заява, пракламацыя, проста акт нянавісці.

На фоне падзей у Нью-Йорку можна спадзявацца, што бліжэй да Захаду пасунецца і Расія. Зрэшты, каментатары ГРТ ужо кажуць, што “мы адзіная цывілізацыя”. Магчыма, падзеі ў Нью-Йорку часова адсунуць назад, здымуць з парадку дня пытанне пра адмену дамовы

У нью-йоркскіх развалінах.

на Супрацьракетнай абароне. Магчыма, будзе перагледжана і праграма СОІ, што патрабуе далейшых выдаткаў, якія зараз будуць патрэбны на аднаўленне страт пасля тэрактаў. Зрэшты, павінна змяніцца і пазіцыя Расіі да Ірака, лівійскага і іншых адыёзных рэжымаў.

Я таксама спадзяюся, што еўрапейскія дзяржавы — найперш Англія і Францыя — таксама скаардынуюць сваё, на маю думку, занадта ліберальнае стаўленне да мусульманскіх супольнасцей ва ўласных краінах. Этнічныя групоўкі ў заходніх краінах карыстаюцца ўсімі свабодамі і дабротамі ліберальнай цывілізацыі і разам з тым працягваюць жыць па ўласных, часам варварскіх звычаях. Ёсць людзі (не істотна, якой нацыянальнасці і веравызнання), якія паспяхова інтэгруюцца ў заходняе грамадства, а ёсць тыя, што жывуць на Захадзе і выкарыстоўваюць дэмакратыю і свабоду для барацьбы з тым жа Захадам, з’яўляюцца грамадзянамі ЗША і еўрапейскіх краін і разам з тым ненавідзяць гэтыя краіны. Відавочна, што тэракты ўчынілі тыя, хто даўно і легальна жыве ў ЗША (магчыма, і грамадзяне краіны) — у прыезджых не было б столькі магчымасцяў для падрыхтоўкі. Якой дзяржаве патрэбны нелаяльныя грамадзяне, якія мараць толькі зруйнаваць гэтую дзяржаву? Лагічна чакаць узмацнення правіл міграцыі ў Злучаныя

Штаты, а таксама выдачы віз? [illegible] амерыканскага дамінавання ў свеце, няхай на секунду задумаюцца, якая іншая звышдзяржава, якія “сусветныя паліцэйскі” іх бы задаволіў. Кітай, дзе жыццё чалавека нічога не каштуе? Расія, дзе інтарэсы дзяржавы ніколі не супадалі з інтарэсамі канкрэтных людзей? Ісламскі свет? Вы хочаце, каб нашы жанчыны насілі паранджу, зладзеям адразалі рукі за крадзеж (тады усе калгаснікі без рук хадзіць будуць) і за ўжыванне алкаголю саджалі (большасць насельніцтва за кратамі апынецца)? Калі хаця б на хвілінку задумацца, што чакае свет у выпадку дамінавання Кітая, ісламу альбо Афрыкі, то становіцца страшна.

Ды і зразумелы ўплыў падзей у Нью-Йорку на беларускую палітыку. Штатам зараз не да Беларусі, відавочна, што гэтыя дні і тыдні амерыканскае кіраўніцтва будзе надаваць менш увагі беларускім падзеям, зрэшты, як і ўсім сусветным.

Віталь ЦЫГАНКОЎ.

Званіце ў Нью-Йорк

Міністэрства замежных спраў рэспублікі паведамляе, што інфармацыю аб беларускіх грамадзянах, якія знаходзіліся 11 верасня ў Нью-Йорку, можна атрымаць па тэлефонах генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Нью-Йорку: 8-10 (1212) 68-25-392 і МЗС Рэспублікі Беларусь у Мінску: 222-26-62.

Паводле звестак генконсульства, беларускія грамадзяне — супрацоўнікі сакратарыята ААН і члены іх сем’яў (каля 50 чалавек) — не пацярпелі, паведаміў БелаПАН прэс-сакратар МЗС Беларусі Павел Латушка. Паводле яго слоў, цяпер дыпламатычнае прадстаўніцтва рэспублікі ў Нью-Йорку сумесна з Дзярждэпартаментам ЗША і авіякампаніямі, самалёты якіх 11 верасня пацярпелі катастрофы, удакладняе інфармацыю аб магчымым знаходжанні на борце гэтых самалётаў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

Метро

Апавяданне

Прачнуўся ён рана, хоць спяшацца не было куды. Куды ўжо спяшацца, калі пратэпаў па зямлі сем дзесяткаў з гакам. А ўставаць рана прывучыла жыццё. З маленства даводзілася пасвіць гусей, потым — цяляты, каровы. Маці шкадавала яго, але будзіла — трэба, што зробіш. Цяпер можна спаць позна, ды не спіцца.

Узімку ён ляжыць даўжэй — не, не спіць, думае, згадвае, качаецца ў ложку, каб не ўключаць дужа рана святло, бо за яго ж трэба плаціць. А колькі той пенсіі! Кот наплакаў. Улетку іншая справа: яшчэ пяці няма, а ўжо відна. Падняўся, зайшоў у другі пакой — як там унук?

Віталік спаў, закінуўшы рукі за галаву, коўдра з’ехала на падлогу, да пояса ўнук быў голы. Хударлявы, танклявы, але ўжо даволі доўгі — гэткі родны, блізкі. Гэта працяг ягонага, дзедавага жыцця.

Людзі, якія мелі ўладу, зрабілі ўсё, каб ён, Стах Крупеня, не меў працягу, каб ніколі не вярнуўся з Калымы. А ён выжыў, вярнуўся на радзіму, ды не адзін — з жонкаю, лагернаю медсястрою. Дзяўчына палюбіла зэка-беларуса, і гэтае каханне памагло Стаху выстаяць. Выгадавалі яны трох сыноў, маюць пяцёра ўнукаў. Віталік — самы малодшы.

Дзед Стах накрыў унука, той нешта мармытнуў, квола ўсміхнуўся, павярнуўся на бок і зноў заснуў. Раптам збоч падушкі дзед убачыў цацачны пісталет. Узяў, разгледзеў. Вялікі, але надзіва лёгкі, сярэбрана-бліскучы, з чорнай шурпатай рукаяткай, мушкай і прораззю прыцэла. Амега, мэйд ін Чына — напісана па-ангельску. Ну, кітаёзы, такую цацку выштукавалі, як сапраўдны маўзер. Нешта падобнае насіў камандзір іхняга партызанскага атрада, у якім Стась трапіў шаснаццацігадовым падлеткам. О, як марыў ён тады пра баявы пісталет ці аўтамат! А даводзілася цягаць на плячы даўжэзную цяжкую вінтоўку.

Як даўно тое было!..

А ўчора дзед Стах — Стэфаній Адамавіч Крупеня, у лагеры яго дражнілі “стаханаўцам”, меў вялікую радасць: парыўся з унукам у лазні.

Якое гэта шчасце — лагодна, ашчадна хвастаць бярозавым венікам распаранае чырвонае цельца малога мужычка. Учарашняй лазні і радасці магло б не быць — памагло няшчасце. Забалелі ў дзеда Стаха ногі. Яны баляць не першы год, бывае, адпусцяць, асабліва зімою, калі меней тупаніны. А тут на пачатку лета прымусілі шукаць ратунку ў паліклініцы. Маладая вастраносая дзяўчына-хірург загадала зрабіць прысяданне. Стах паспрабаваў, але прысяданне атрымалася няўдалае, так і стаяў, раскірэчыўшы ногі.

— *Глубже!* — строга сказала доктар.

— Каб я мог... *глубже*, дык не прыйшоў бы да вас...

Дзяўчына засаромелася, пачала распытваць, ці ёсць дача, што ён там робіць.

— Усё раблю, што трэба.

— І зямлю капаеце?

— Капаю.

— Дык што ж хочаце?

— Хачу, каб мае ногі хадзілі па зямлі. Бо я не стаміўся жыць.

— Вы аптыміст, дзядуля. Магчыма, гэта вам і паможа, — усміхнулася доктар і прапісала дзесяць сеансаў электратокам. Такія працэдуры Стах прымаў і раней, але да гэтай дзяўчыны трапіў упершыню.

Вось і атрымалася, што дзед Стах аказаўся прывязаным у горадзе на дзесяць дзён. Ён шчыра хадзіў на працэдуры, чытаў, глядзеў тэлевізар. А тут пазваніла нявестка: Віталіку тыдзень да ад’езда ў лагер, сядзіць цэлымі днямі ля тэлевізара, да бабулі на дачу не хоча...

— А з вамі згодны пабыць.

— Ну, калі згодны, дык прывозь.

Так і сталі жыць дзед з унукам.

Сёння Стах запланаваў звазіць унука ў Батанічны сад, пакатацца на метро. На метро яны ўжо ездзілі тры дні запар. Агледзелі ўсе станцыі. З усіх даброт цывілізацыі Стах Крупеня дужа шанаваў метро, любіў і ванную. Але метро — гэта раскоша асаблівая. Едзь сабе ў любое надвор’е, ні дождж, ні снег не перашкода. І ўсё дакладна, чыста, прыгожа.

І была яшчэ адна прычына катаць унука на метро. Пра яе Віталіку дзед не казаў. Не гаварыў яму нічога і пра Калыму. Некалі асцерагаўся гаварыць сваім дзецям, таварышам па рабоце, як стаў нацдэмам у дваццаць гадоў...

Пасля Калымы ўладкавацца на працу было вельмі складана. Паспрыяў даўні сябра, з якім некалі вучыўся ў педтэхнікуме. Прынялі Стаха ў міністэрства фінансаў, у гаспадарчую групу, дзе ён быў і сталяр, і цясляр, і электрык.

Некалі бацька ягоны, Адам Крупеня, умеў і сталярнічаць, і цяслярыць, і печ скласці, быў слынным пчаляром і садоўнікам. А яшчэ Адам Крупеня валодаў мядзведжаю сілай. І, маючы залатыя рукі, не спіўся дачасна, як бывае з масцеравітымі людзьмі на Беларусі, ды і ў іншых краях. Вучыў Крупеня ўмельству і сваіх дзяцей. Не раз успамінаў бацьку Стах на Калыме, у душы дзякаваў за навуку. Стаханаўцам Крупеню дражнілі не за імя Стэфаній-Стах, а за тое, што ўмеў працаваць спрытна, зберагаючы сілу, любую справу спярша рабіў у галаве, а тады браўся рукамі.

Неўзабаве яго ацанілі і ў міністэрстве фінансаў. У тыя гады менавіта фінансавы міністр чытаў даклады на беларускай мове. Ды не абы-якія даклады, а пра бюджэт. Дэпутаты ўважліва слухалі, рабілі выгляд, што яны ўсё разумеюць. Зрэшты, разумення ад іх ніхто не патрабаваў, яны падымалі рукі, як Ванька-ўстанька, і зацвярджалі тое, што ім прапанавалі. Альтэрнатывы не магло быць.

Час мяняўся, пачалася хрушчоўская адліга. Неяк набраўся смеласці Стах і адчыніў цяжкія дзверы дома з аграмаднымі калонамі на галоўным праспекце Мінска. Дамогся прыёму ў высокага начальніка КДБ. Той слухаў яго, здзіўлена глядзеў з-пад акуляраў, як на нейкага выкапня. Потым ціха працадзіў скрозь зубы:

— Ах ты, нацдэмовский недобиток! Как это тебе удалось выжить?! И ты еще хочешь реабилитации?!

Шэра-стальныя вочкі, быццам свярдзёлкі, праціналі Крупеню. Ён моўчкі выйшаў з кабінета, баючыся азірнуцца назад.

А калі разабрацца, дык які ён вораг? Малады настаўнік, як і ягоныя паплечнікі, хацеў, каб школы на Беларусі былі беларускія, каб мова родная скрозь панавала на нашай зямлі. Дык хіба ж гэта злачынства? Ва ўсім свеце гэткіх людзей лічаць за патрыётаў, шануюць іх, спрыяюць ім, ганарацца імі, бо яны стрыжань нацыі. А тут — вораг народа. За што? За якія грахі?

Усё жыццё Крупеня шукаў адказу на гэтыя пытанні. Часам здавалася, што ён урэшце ўсё зразумеў, але жыццё зноў паварочвалася іншым бокам.

Як радаваўся, калі аднойчы малы Віталік прыйшоў з садка і прачытаў вершык:

Просіць пеўніка хлапец:
— Ты пазыч мне грабянец.
Валасы я прычашу,
табе хлеба накрышу.
— Не прычэшаш валасы,
мой грабеньчык для красы.

Літару “р” малы вымаўляў, як “л”, і таму гэты вершык гучаў асабліва пацешна і міла. Дзед Стах аж слязу пусціў: хоць малодшы ўнук вырасце сапраўдным беларусам. Сыны ягоныя ведалі родную мову, з бацькамі гаварылі па-беларуску, а за межамі дома, як і ўсе, — на трасянцы, якая лічылася афіцыйнай. І начальнікі іхнія, “вертыкальныя ратнікі” казалі з высокіх трыбун: барба за ўраджай, і думалі, што яны гавораць з народам на “великом и могучем...”.

Жонка Еўдакія, сібірачка, аказалася этнічнай беларускай: ейны дзед па матчынай лініі быў касінерам Каліноўскага, пасля падаўлення паўстання апынуўся ў Сібіры. Мабыць, у генах Дуні-Еўдакіі жыла прага беларушчыны, бо яна надзіва хутка навучылася спяваць беларускія песні, а потым і гаварыць на мове продкаў. Але ў Мінску, у сталіцы савецкай Беларусі, муж-нацдэм і жонка-сібірачка гаварылі па-беларуску на кухні ды ў спальні. А на працы — Дуня ўладкавалася медсястрой у вайсковым шпіталі, толькі па-расійску. Яна палохалася хоць адным словам выказаць непавагу да савецкай улады. Страх яшчэ памацнеў, калі мужа адмовіліся рэабілітаваць.

Страх жыў і ў душы Крупені. Страх не за сябе, а за сям’ю, за дзяцей, а потым і за ўнукаў. Крупеня разумеў, што ідзе ідэалагічная вайна супраць яго народа. А на вайне не бывае без ахвяраў. Таму за сваё жыццё не баяўся, хоць часам скрушліва думаў: яго трэба называць не Стах, а Страх Крупеня.

... У восем гадзін, як і дамовіліся ўчора, дзед пабудзіў унука. Яны збегалі на возера, зрабілі зарадку, паплавалі. Стах радаваўся, што можа трушком бегчы — працэдуры пайшлі на карысць, ды і агарод капаць не трэба, адпачылі ногі. Краем вока пазіраў на Віталіка. Той, расчырванелы, пасвяжэлы, бег лёгка, спрытна.

— Ты бяжы паперадзе. А я ўслед за табою.

— Ты некалі казаў: лепей — следам за дзедам. Пойдзем разам.

— Хай будзе так.

Пашыбавалі праз пералесак бадзёрым крокам. Мне памаглі працэдуры, а Віталіку — метро, падумаў Крупеня. Там ён чуе беларускую мову.

Зноў зашчымела душа: дажыліся, беларускую мову, хай сабе штучна-механічную, можна пачуць у падзямеллі, у метро, ды ў замежнай амбасадзе з чужым акцэнтам.

На балконе, калі вешаў мокрыя плаўкі, раптам убачыў маленькае дзіва: у кутку, на стыку бетоннай пліты і бляхі, зелянеў шматок моху, тырчалі некалькі зялёных шыльцаў травы. А між імі высіўся... васілёк. Ён ужо рыхтаваўся цвісці — выкінуў тры бутончыкі, верхні ўжо кучараваўся блакітна-шызым чубком.

Пасля сняданку паказаў васілёк Віталіку. Той асабліва не здзівіўся, але выслухаў дзеда ўважліва.

Малеча, яшчэ не разумее, якая патрэбна сіла, каб вырасці паміж бетоннай плітой і бляхай, падумаў Стах. Апошнія гады яго ўсё болей здзіўляла магутная жывучасць усяго жывога.

У Батанічным садзе яны былі доўга. Дзед ужо змарыўся, а ўнуку ўсё хацелася агледзець, абысці вакол возера, дзе плаваюць лебедзі, панюхаць гэтульскі самых розных кветак. Хоць ногі зноў пачалі балець, Стах радаваўся: унук любіць прыроду. Яшчэ адзін дзень пражыве без пачварнай скрынкі — тэлевізара.

Потым пакаталіся на метро. Летнім днём у вялікім горадзе задуха, а ў метро прахалода. Любата! Стах нават трохі прыдрамаў ці зрабіў выгляд, што заснуў, і раптам пачуў звонкі ўнукаў галасок:

— Дзеда! Наступны прыпынак наш! Плошча Якуба Коласа!

— Ага, унучак, наша станцыя. Наша... — дзед Стах захваляваўся і адказаў занадта ціха.

Насамрэч яму хацелася крычаць...

ФБР известны имена террористов

ФБР арестовало первых подозреваемых в совершении терактов и установило личности угонщиков самолета, который разбился возле Питтсбурга. В Нью-Йорке из-под обломков извлечены первые оставшиеся в живых служащие, работавшие во Всемирном торговом центре.

В среду агенты ФБР арестовали нескольких подозреваемых в совершении терактов. Как сообщает CNN, около 13.00 по местному времени полицейские оцепили бостонский отель Westin-Copley Hotel и вывели оттуда несколько человек. Представители ФБР утверждают, что эти люди как минимум “знают о терактах”. Одновременно агенты арестовали несколько человек в городе Веро Бич (штат Флорида).

Кроме того, как стало известно телекомпании Fox, спецслужбам США удалось установить личности угонщиков самолета авиакомпании United Airlines, который разбился возле Питтсбурга. Как рассказал компании представитель администрации президента США, пожелавший остаться неназванным, ФБР удалось выявить связь угонщиков с Усамой бен Ладеном по хорошо сохранившимся на месте катастрофы уликам. Правда, кто именно эти люди, чиновник не сообщил.

Пока что бен Ладен остается главным подозреваемым в организации терактов. И хотя окружение террориста №1 не раз отрицало это, власти США, похоже, собираются сделать все, чтобы устранить его и любое государство, которое попытается его укрыть. Так, в среду американский сенат единогласно проголосовал за специальную резолюцию Конгресса, в которой заявлено, что США, в соответствии с международным законодательством, имеют право ответить на теракты в Нью-Йорке и Вашингтоне.

Тем временем из-под завалов Всемирного торгового центра (ВТЦ) в Нью-Йорке впервые за все время спасательных работ извлечены четверо сотрудников компаний, располагавшихся в разрушенных башнях. Двое мужчин и две женщины были срочно госпитализированы в одну из больниц Нью-Йорка. Состояние мужчин врачи характеризуют как критическое.

Таким образом, число живых людей, извлеченных из-под обломков 110-метровых небоскребов, составило 13 человек. Ранее спасатели вытащили 6 пожарных и 3 полицейских, которые принимали участие в спасательных работах. Теперь у ликвидаторов катастрофы появилась уверенность, что под обломками могут находиться живые люди, тем более что за последние сутки не раз из-под завалов исходили звонки сотовых телефонов. Как рассказал компании CNN мэр Нью-Йорка Рудольф Джулиани, два человека позвонили родственникам прямо из-под обломков. Никаких подробностей мэр не сообщил, поэтому, возможно, что именно эти люди были спасены.

Работники ФБР.

По последним данным властей США, из-под завалов извлечены 55 тел погибших, пропавшими без вести до сих пор считаются 300 пожарных и полицейских. Как отмечают спасатели, сейчас нельзя говорить даже о приблизительном количестве жертв. На определение этих цифр у них уйдет не меньше нескольких недель, потому что до сих пор работы велись далеко от эпицентра многометровых завалов. Пробраться к нему не удастся даже в течение недели.

